### «ПЕВЕЦ-ПОПУГАЙ»

Дети и родители стоят кругом, в центре которого лежит разноцветный мяч. По считалке выбирают водящего:

Раз, два, три!
Раз, два, три!
Быстро в круг выходи.
Бери мяч, запевай,
С попугаем поиграй!

Выбранный водящий выбегает в центр круга, берет мяч в руки и говорит:

Ты, певец-попугай,
За мной точно повторяй.
Повторяй, не зевай
И красиво допевай!

Затем водящий поет куплет или припев любой песни. Закончив пение, он бросает мяч одному из детей, а сам остается на месте. Ребенок, поймавший мяч, становится певцом-попугаем. Он повторяет пропетый водящим фрагмент песни и допевает следующий куплет.

Если песня повторена и допета правильно, все играющие аплодируют. Певец-попугай занимает место водящего, а тот становится в круг к играющим. При повторении игры исполняется новая песня.

Если певец-попугай повторяет за водящим верно, но затрудняется в допевании, то водящий и остальные играющие допевают начатую песню хором. Певец-попугай бросает мяч водящему, и игра продолжается с тем же водящим, но с новой песней. Водящий может останавливаться на середине музыкальной фразы, не допевая ее до конца.

*Разучите игру с детьми на музыкальных занятиях. Убедитесь, что дети знают много песен и могут их свободно исполнять.*

*На празднике подробно объясните правила родителям и пригласите их сыграть вместе с детьми.*



# У творчым гарэнні

# Алена Атрашкевіч

**ГАЖЭЎСКАЯ Таццяна Станіславаўна** –
выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Алена Віктараўна Атрашкевіч — таленавіты кампазітар, цікавы субяседнік, абаяльная жанчына. Нарадзілася яна ў г. Барысаве. “Творчы шлях пачаўся ў васьмігадовым узросце, калі яе, школьніцу з г. Чашнікі, што на Віцебшчыне, запрасілі на вучобу ў ліцэй пры Белдзяржкансерваторыі. Заўважыўшы схільнасці дзяўчынкі да стварэння музыкі, кампазітар К.Цесакоў зарыентаваў яе на кампазітарскую сцяжыну. У 1984 г. па заканчэнні ліцэя яна паступае ў Ленінградскую кансерваторыю імя М.А.Рымскага-Корсакава. Сапраўднай падзеяй для яе стала сустрэча з Б.Арапавым. Для Алены ён стаў педагогам-сябрам, мудрым настаўнікам, які беражліва накіроўвае станаўленне вучаніцы, ва ўсім выхоўваючы самастойнасць яе творчай асобы. У класе Б.Арапава Алена спасцігла галоўнае: каб набыць права на эксперымент, знайсці самастойны шлях у кампазітарскім рамястве, неабходна апора на класічныя асновы музыкі”[1].

Пасля заканчэння кансерваторыі яна трапляе ў г. Маладзечна, дзе працуе і па сённяшні дзень у музычным вучылішчы імя М.Агінскага. Алена Віктараўна Атрашкевіч выкладае як тэарэтычныя дысцыпліны — тэорыю музыкі, гармонію, сальфеджыо, аналіз музычных форм, чытанне партытуры, інструментоўку, так і кампазіцыю. Клас сачынення музыкі, створаны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аленай Віктараўнай, існуе ўжо шмат гадоў. Гэта сапраўдная творчая лабараторыя, дзе праходзяць сваё станаўленне маладыя таленты, здольныя ствараць музыку. Некаторыя з яе выхаванцаў з'яўляюцца лаўрэатамі кампазітарскіх конкурсаў, скончылі ці працягваюць сваё навучанне ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Алена Віктараўна падрыхтавала праект праграмы па кампазіцыі для навучэнцаў вучылішчаў мастацтва. Праграма выдадзена Інстытутам праблем культуры ў 2002 годзе.



Алену Атрашкевіч ведаюць не толькі як таленавітага кампазітара і педагога. Разам з Пятром Туронкам яна ўзначальвае знакамітую дзіцячую эстрадную студыю, якая прымае актыўны ўдзел у жыцці горада, раёна і рэспублікі. Салісты гэтага калектыву з'яўляюцца лаўрэатамі і дыпламантамі конкурсаў "Спяваем з аркестрам", "Тэлебом" (Мінск), "Рождественские каникулы» (Москва), "Зямля пад белымі крыламі" (Мазыр), "День рождения" (Санкт-Пецярбург), міжнародных фестываляў духоўнай музыкі ў Даўгаўпілсе, "Звёздочка" (Адэса), "Усе мы родам з дзяцінства" (Мінск), "Славянскі базар" (Віцебск) і інш.

Да важнага моманту свайго творчага жыцця — уступлення ў Саюз кампазітараў у 1997 годзе — Алена Віктараўна прыйшла з дастаткова вялікім спісам сачыненняў. Гэта вакальная, харавая, інструментальная музыка і песні.

Талент кампазітара вельмі шматгранны. Сярод напісаных ёю твораў квартэты, вакальна-сімфанічная кампазіцыя для хору, аркестра і саліста "Малітва" на словы В.Аколавай, кантата для сімфанічнага аркестра, хору і тэнара на словы М.Дудзіна, творы для народнага аркестра і апрацоўкі папулярных мелодый народаў свету, музыка для спектакляў у пастаноўцы Мінскага абласнога драматычнага тэатра, мюзіклы для дзяцей "Чарадзейства ў краіне Оз", "Проста Мяфа". У сваёй творчасці Алена Атрашкевіч аддае перавагу харавой і вакальнай музыцы. Ёй належаць дзесяць харавых апрацовак беларускіх народных песень, тры хоры на словы А.Фета, Цыкл без слоў, прысвечаны класікам, інструментальна-харавы трыпціх на словы Г.Рубацкай "Ой, ружанька", харавы дыпціх "Мая гарэза", "Добрай ночы" на словы В.Жуковіча, духоўная музыка для хору, эстрадна-песенны цыкл для жаночага хору (харавога ансамбля) на словы А.Марозава, ваенна-патрыятычны цыкл песень на словы В.Аколавай, песні для дзяцей, калыханкі і інш.



*Эстрадная студыя "Спяваем разам"*

У харавой музыцы Алена Атрашкевіч імкнецца знайсці адметную інтанацыю, мелодыі яе простыя, блізкія па духу да народных. Кампазітар дэманструе цудоўнае веданне спецыфікі харавой фактуры, шматграннасць жанравых сувязей і вобразаў.

Асабліва ўражвае вобраз любоўнага развітання ў хоры "Крушына, крушына" на верш Г.Рубацкай. Гэты твор заваёўвае сэрцы слухачоў асаблівым натхненнем, узнёсласцю, цеплынёй, шчырасцю, пяшчотай і пранікнёнасцю. У хоры "Свечка згасла" з цыкла "Случарыны" (на словы В.Аколавай) паказана згасаючае жыццё, зломаны лёс жанчыны. Адчуваннем радасці жыцця прасякнуты хор "Дзень добры, вечар" гэтага цыкла.

Кожная з харавых мініяцюр непаўторная па тонкасці перадачы народнага духу, карцін народнага жыцця.

Асноўнымі рысамі харавой творчасці кампазітара з'яўляюцца беражлівае стаўленне да слова, не толькі імкненне да дакладнасці націску пры "перакладанні" паэтычнай першакрыніцы, але і пошук патрэбнай інтанацыі, выразнай падачы паэтычнага настрою.

Што тычыцца мелодыі, то кампазітар імкнецца да яркай, выразнай, запамінальнай і індывідуальнай інтанацыі, да спалучэння шырокіх "крокаў" з паступенным рухам.

Для яе гармоніі характэрны шырокі спектр выкарыстання акордыкі. Алена Атрашкевіч дасканала валодае ведамі класічнай і рамантычнай гармоніі, выкарыстоўвае сучасныя гарманічныя сродкі. Але яна не гоніцца за звышэфектнымі і складанымі поліакордамі, а ўспрымае акорд як асобую фарбу. У яе вельмі добрае фанічнае адчуванне таго ці іншага сугучча. Нярэдка меладычнае развіццё нараджае дакладны гарманічны рад, і наадварот, за гармоніяй "накіроўваецца" мелодыя. Кампазітар выкарыстоўвае ў сваіх харавых творах шмат альтэрыраваных акордаў, адхіленняў, мадуляцыйных пераходаў, неакордавых гукаў, сугуччаў нятэрцыевага складу або наўмыснай гарманічнай яснасці (класічнасці), часта звяртаецца да мажору-мінору. (Напрыклад, Цыкл без слоў, прысвечаны класікам, дыпціх і "Сакраментальная паэма" на словы В.Жуковіча.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паколькі Алена Атрашкевіч беражліва ставіцца да слова, то ў яе творах чуецца рытмічная натуральнасць "амузыкаленага" слова, а адсюль і натуральнасць ва ўспрыманні музычнага матэрыялу слухачамі.

Кампазітар імкнецца да цыклічных форм, што дазваляе разнастайна перадаць кантрастны настрой паэта, а таксама выказаць больш поўна свае думкі.

У некаторых харавых творах назіраецца яснае імкненне да рэпрызнасці (напрыклад, крайнія часткі з Цыкла без слоў, прысвечанага класікам, І і ІІ часткі цыкла на словы Г.Рубацкай "Ой, ружанька", апрацоўка народнай песні "Купалінка" і інш.), куплетнасці (хор "Голас Душы" на словы С.Законнікава; апрацоўкі народных песень "Ой сівы конь бяжыць", "Ручнікі"). Ёсць творы, напісаныя ў свабоднай форме (хор "О, Марыя" на словы М.Дуксы, некаторыя часткі з "Сакраментальнай паэмы", "Малітва" на словы В.Акалавай).

Кампазітар часцей за ўсё выкарыстоўвае гамафонна-гарманічную фактуру, напрыклад, хоры "Ластаўкі над вакном", "Крылаты ўспамін" на словы Ст.Валодзькі, хор "Голас Душы" на словы С.Законнікава і інш. Нярэдка ў яе творах сустракаюцца падгалоскі, імітацыі, унісоны, удваенні, кантрапунктычныя лініі, напрыклад, у хоры "Зязюлька" на словы І.Снарскай, у апрацоўцы народнай песні "Юрачка".

Музычная тканіна твораў А.Атрашкевіч складаецца такім чынам, каб слова не гублялася. Вялікае значэнне надаецца дакладнаму выкананню канчаткаў фраз.

Кампазітар пазбягае выкарыстання крайніх гукаў у партыях, выключэнне складаюць высокія ноты ў кульмінацыйных момантах. Дзякуючы гэтаму гучанне становіцца больш натуральным.

Кожны яе твор мае дакладную ступень складанасці, звязаную з выканаўчымі магчымасцямі.

Кампазітар піша харавыя творы для розных саставаў: змешанага, жаночага і мужчынскага хароў. Некаторыя з твораў, якія спачатку былі задуманы для ансамблевага выканання, паспяхова гучаць і ў змешаным хоры. Шмат якія апрацоўкі беларускіх песень, што спяваюць многія беларускія калектывы, былі задуманы і выконваліся вакальным ансамблем "Anima" (г. Маладзечна). Харавым выканаўцам гэтых твораў стаў Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам І.Мацюхова. Некаторыя свае творы аўтар сама "перакладае" для іншых выканаўчых саставаў, напрыклад, хор "О, Марыя" на словы М.Дуксы, "Душа мая" на словы М.Дудзіна.

Ёсць у А.Атрашкевіч і апрацоўкі для хору беларускіх народных песень — "Юрачка", "Полька-Янка", "Купалінка", "Камар лазню тапіў", "Кацілася чорна галка" і інш., папулярных рускіх мелодый — "Катюша", "Вечерний звон", "Очи черные", "Однозвучно гремит колокольчик", апрацоўка грузінскай народнай песні "Суліко".

Асаблівае месца ў творчасці кампазітара займае духоўная музыка, сярод якой вылучаюцца хоры "О, Марыя", "Голас Душы", "Крылаты ўспамін".

Цэнтральнае месца ў духоўнай музыцы займае "Сакраментальная паэма". Складаецца твор з пралога, сямі асноўных частак і эпілога. У ім арганічна спалучаюцца сольныя партыі сапрана і барытона, а таксама сола дзіцяці, харавыя і арганныя партыі, маналогі чытальніка. Кожная частка — гэта асобны музычны твор, які ўзаемадзейнічае з іншымі часткамі на аснове лейттэматызму і лейтгармоніі. Усе яны яскравыя і не падобныя адна на адну, але ў цэлым узаемазвязаныя адзіным сэнсам: усе ласкі і дары нябесныя вынікаюць з бясконцай і міласэрнай любові Бога да людзей. Музыка "Сакраментальнай паэмы" пакарае сэрцы слухачоў шчырасцю, адкрытасцю, паўнатой пачуццяў. Яна прымушае слухача суперажываць, успрымаць тое, што гучыць, як асабістае і таму незвычайна сугучнае сённяшняму часу.

Відавочна цікавасць Алены Атрашкевіч і да джазу, і да поп-музыкі. Пры гэтым ярка выяўляецца імкненне кампазітара аб'яднаць класічную і лёгкую музыку, знайсці шляхі да падобнага спалучэння.

Творы кампазітара гучаць па радыё і тэлебачанні. Шмат з іх знаходзіцца ў фондах Гостэлерадыё.

Выдавецтва "Чатыры чвэрці" выпусціла першы зборнік песень кампазітара Алены Атрашкевіч для дзяцей "Лодка дзяцінства". "Гэты натадрук — вынік сумеснай творчай працы маладога таленавітага аўтара музыкі і розных беларускіх паэтаў, такіх, як В.Жуковіч, Т.Мушынская, Н.Танюкевіч, Л.Ляшчэвіч, Т.Трафімава... Ствуральнікі песень імкнуліся перадаць тонкасць унутранага свету дзяцей і падлеткаў, іх трывогі, турботы, пачуцці і перажыванні"[2].

Песні, змешчаныя ў зборніку, разлічаны на выканаўцаў рознага ўзросту і здольнасцей, іх можна падабраць нават пад характар саліста. Многія песні можна смела выконваць сола або ансамблем ці хорам. Рускамоўныя і беларускамоўныя варыянты тэкстаў шэрага песень таксама даюць магчымасць выбару выканаўцам. Гэтым зборнікам ахвотна карыстаюцца многія выкладчыкі дзіцячых музычных школ і студый нашай рэспублікі.

Увогуле ўсе песні А.Атрашкевіч адзначаюцца яркай меладычнасцю і вобразнасцю, адметнасцю гарманічнай мовы. Кампазітар арыентуецца на стыль сучаснай "лёгкай" музыкі, але не апускаецца да ўзроўню "папсы". Некаторыя песні ўяўляюць сабой даволі складаныя ўзоры сучаснай музыкі і патрабуюць ад выканаўцаў пэўнага майстэрства. Разам з тым тэмы песень лёгка ўспрымаюцца на слых і запамінаюцца.

Зборнік прываблівае яркім нястрымным мажорам, жыццесцвярджальным ладам. Песні розныя па тэмах і тэмпарытмах, вобразах і музычнаму вырашэнню, нарэшце, па агульнаму гучанню. Яны лірычна-задуменныя, імклівыя, экстравагантныя, гарэзлівыя, паэтычныя, прасякнутыя гумарам і добрай усмешкай. Але іх аб'ядноўваюць светлае, радаснае, сапраўды дзіцячае ўспрыманне рэчаіснасці, непасрэднасць, захапленне жыццём, а таксама вельмі каштоўная здольнасць бачыць у ім найперш прыгажосць і рамантыку.

Нeяк раз кампазітар Л.Захлеўны здзівіўся: "Алена, колькі Бог накідаў у тваю галаву мелодый!". Калі-нікалі яна кажа сваім вучням: "Ведаеце, вельмі часта вашымі галасамі спявае мая душа".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КРЫЛАТЫ ЎСПАМІН

Словы Ст.Валодзькі

Музыка А.Атрашкевіч




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівай пяшчотай пранікнуты цыкл зборніка “25 калыханак” на тэксты В.Аколавай. Ён больш блізкі да акадэмічнай лініі песеннага жанру. “Калыханкі” — вакальныя мініяцюры, у якіх адлюстраваны погляд на свет вачамі дзіцяці. Падобна загадкавым казачным вобразам дзіцячага сну, перад слухачамі па чарзе праходзяць дзеючыя асобы цыкла — Месяц, Гусь, Кот, вобразы роднай прыроды і сам Сон, што раз-пораз мяняе свой воблік.

Калыханка праламляецца ў цыкле праз прызму сучасных інтанацый; фальклорны пачатак праступае толькі ў вобразным ладзе з яго традыцыйнымі казачнымі персанажамі і ў характэрна “калыхальным” тэрцыевым матыве — лейтінтанацыі “баю-бай”.

Цэласнасць цыкла ствараецца адзінствам зместу, наяўнасцю “скразной” тэрцыевай папеўкі, якая гучыць ужо ў першай песні, нарэшце, абрамленнем, ролю якога выконвае першая і заключная мініяцюры. У цыкле шмат меладычных знаходак: непаўторна перададзена атмасфера цішыні, спакою.

А.Атрашкевіч імкнецца ў песнях знайсці пункт судакранання акадэмічнай лініі жанру і поп-музыкі; сінтэзаваць багатыя традыцыі песеннай культуры з выяўленчымі магчымасцямі блюза, спірычуэл, інструментальнага і вакальнага джаза. Песня, як мяркуе кампазітар, павінна ўспрымацца на адным дыханні, а зрабіць яе запамінальнай, непаўторнай можа толькі знойдзенае ў мелодыі “залатое ядро”.

Тыповымі рысамі песеннага стылю кампазітара з’яўляюцца высокі густ, своеасаблівасць інтанацый, запамінальнасць музычнага вобраза. А адметнымі рысамі Алены Атрашкевіч з’яўляюцца бескарыслівасць, энтузіязм і любоў да дзяцей, да справы, якой яна служыць...

[1] Ляшчэвіч Л. Партрэт у інтэр’еры песні // Мастацтва. 1996. № 1. С. 44.

[2] Федорова Т. Лодка детства // Мастацтва. 2001. № 12. С. 49.

# Студэнцкія гады





***Ад рэдакцыі.*** *Прадстаўляем увазе нашых чытачоў песню Валянціна Вікенцьевіча Карпуця на словы Алы Васільеўны Кажэры “Студэнцкія гады”.*

*В.Карпуць скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу баяна. З 1969 года працуе ў БДПУ імя Максіма Танка. З 1980 года — загадчык кафедры народных інструментаў музыкальна-педагагічнага факультэта, дацэнт. Спалучае педагагічную працу з музычнай творчасцю, з’яўляецца аўтарам шэрага твораў для баяна, хору, салістаў і інш. Сярод іх — “Памяці герояў” на верш Максіма Танка, “Так і не знаю...” на верш Ніны Тарас, “Варыяцыя на беларускія тэмы” для трох баянаў, “Скерца-таката” для баяна, раманс для ансамбля скрыпак і інш.*

*А.Кажэра скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага і ўвесь час працуе на педагагічнай ніве. Пісаць вершы пачала ўжо ў сталыя гады. У 2000 годзе ў выдавецтве “Бібліятэка часопіса “Маладосць” выйшаў зборнік яе вершаў “Літасць надзеі”. Шмат вершаў пакладзена на музыку беларускімі кампазітарамі Л.Захлеўным, Э.Зарыцкім, Л.Шурманам, А.Чыркуном.*

*Песня “Студэнцкія гады” з’явілася вынікам знаёмства і добрых сяброўскіх адносін з кампазітарам Валянцінам Карпуцем. Выдатны напеўны верш акрыліў светлай лірычнай мелодыяй і стаў адной з любімых песень беларускага студэнцтва.*

Прайду па парку роснаму,
Дзе клёны ў два рады,
І уваскрэснуць вёснамі
Студэнцкія гады.
Дзе ты, мая каханая,
Цябе шукаю зноў,
Мая неспадзяваная
Студэнцкая любоў.

*Прыпеў:*
Студэнцкія гады – ружовыя світанні,
Студэнцкія гады – спатканні і растанні.
Аб шчасці мары збудуцца, пакуль ты малады,
Ніколі не забудуцца студэнцкія гады.

І мне цяпер не верыцца,
Што тут твае сляды,
Чароўныя не вернуцца
Студэнцкія гады.
Дзе ты, мая каханая,
Цябе шукаю зноў,
Мая неспадзяваная
Студэнцкая любоў.

*Прыпеў.*

Спыню імгненне светлае,
Як першую зару,
І словы запаветныя
Я ціха паўтару:
Дзе ты, мая каханая,
Як песня аб вясне,
Мая неспадзяваная,
Успомні пра мяне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ